У XVII ст. у мястэчку Любча (Навагрудскі павет) існавала буйнейшая рэфармацыйныя друкарня на Беларусі, у дзейнасці якой атрымалі далейшае развіццё асветніцкія, мастацкія і паліграфічныя традыцыі Ф. Скарыны. Друкарскія матэрыялы былі прывезены з Вільні.

У любчанскай друкарні выдаваліся зборнікі вершаў, творы паэтычных аўтараў, працы гісторыкаў, філосафаў. У Любчы быў надрукаваны шэраг навуковых дапаможнікаў. Кнігі любчанскай друкарні афармляліся сціпла, выкарыстоўваліся ксілаграфіі, наборны арнамент. Упершыню ў беларускім кнігадрукаванні для ілюстрацый шырока ўжываліся гравюры на медзі.

Такім чынам, гісторыя беларускай кнігі – старажытная і вельмі насычаная. Яе з'яўленне абумоўлена распаўсюджаннем хрысціянства і звязана ў першыя стагоддзі свайго існавання менавіта з перапісваннем ці друкам Бібліі і іншай хрысціянскай літаратуры. Наяўнасць шэрагу скрыпторыяў, майстэрнь, тыпаграфій па вытворчасці кнігі сведчыць аб вялікай ролі, якую адыгрывала кніга ў жыцці нашых продкаў. Кнігу заслужана можна лічыць адным з атрыбутаў беларускай культуры.

**УДК 821.161.3**

## КУЗЬМА ЧОРНЫ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ СВЕТАПОГЛЯД

*Студэнт – Кучыц К.В., 49 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны пытанням нацыянальнага светапогляду ў творах К. Чорнага.

**Ключавыя словы:** пісьменства, нацыянальны светапогляд, родная зямля, малая радзіма.

Творы пісьменнікаў-класікаў заўжды актуальныя для культуры, кожнае наступнае пакаленне звяртаецца да іх у пошуках адказаў на запатрабаванні часу.

Знакавая постаць беларускага прыгожага пісьменства – Кузьма Чорны. Яго творчасць мела надзвычайны уплыў на развіццё нацыянальнай мастацкай свядомасці. За К. Чорным даўно і трывала замацаваліся вызначэнні: пісьменнік-філосаф, пісьменнік-псіхолаг, пісьменнік-наватар.

Кузьма Чорны прапанаваў арыгінальную светапоглядную канцэпцыю, канцэпцыю жыцця як радасці. Пісьменнік перакананы, што чалавек створаны для радасці: *“Жыццё – бязмернае і неабдымнае, і перад адчуваннем яго нішто абшары свету, і сэнс яго – у радасці; адчуваючы смутак, істота адчувае і не забывае, что існуе радасць і што ў ёй і ў вечным імкненні да яе – апраўданне жыцця”* [2, т. 1, с. 318].

У творах К. Чорнага ўвасоблены важныя рысы нацыянальнага светапогляду. Перш за ўсё гэта прывязанасць да свайго “роднага кута”, анталагічная злучнасць беларускага чалавека і роднай зямлі.

Злучанасць з зямлёю, з родным у К. Чорнага – анталагічная: *“Якое неба над нашай зямлёй бывае ўвосень”* [2, т. 6, с. 1].

На долю К. Чорнага і яго сучаснікаў выпалі выпрабаванні рэвалюцый, Першай і Другой сусветнай войнаў, змена сацыяльнага ладу, шматлікія акупацыі. Таму К. Чорны так падрабязна апісвае жахі разбурэнняў, татальнае знішчэнне жыцця, ё

Сэнсава-змястоўным для беларускай сітуацыі і беларускай літаратуры становіцца вобраз спустошанага Дому, “раскіданага гнязда”. У рамане “Пошукі будучыні”: *“Яго ўразіла жудасная цішыня ўсюды. Свіранок быў адчынены, і на парозе яго спакойна сядзеў пацук і шморгаў пярэдняй лапаю сабе па носе. Хвост яго звісаў з парога на самы ганак... Гэты малюнак кальнуў Нявадаву душу мацней, як выгляд нежывога чалавека, пад вішняком. Тут ужо было не чалавечнае ўладанне, тут ужо няма чаго рабіць чалавеку”* [3, т. 6, с. 103].

Героі беларускай літаратуры мараць пра спакойнае самадастатковае быццё на сваёй зямлі. Насуперак імкненню пазбавіць сакральнага сэнсу змест паняццяў родная зямля, Айчына беларускія пісьменнікі імкнуцца апаэтызаваць *Родны кут*. Пошукі героямі беларускай літаратуры зямлі – гэта і пошукі самабытнасці, імкненне да ўласнай тоеснасці, а барацьба за зямлю – перш за ўсё барацьба за годнае жыццё, сцвярджэнне права быць гаспадарамі на сваёй зямлі, у сваей Айчыне.

*Родны кут, малая радзіма* – гэта комплекс пэўных фактараў, якія складаюць “духоўную тапаграфію” аўтара. Можна сказаць, што *родны кут* стаў сакральнай нацыянальнай міфалегемай. Абагульнены мастацкі вобраз роднага кута вызначае спецыфіку беларускага вобраза свету, дазваляе асэнсаваць гісторыясофскую канцэпцыю Беларусі.

Героі К. Чорнага прагнуць не багацця, не задавальнення нейкіх амбіцый. Шчасцем для іх з’яўляецца элементарнае, натуральнае – проста жыць на сваёй зямлі, працаваць, гадаваць дзяцей: *“Але ж я жыў гэтулькі год у мілай мне працы, і жыццё гэтае само па сабе нельга назваць шчасцем”* [2, т. 6, с. 74], *“...а ўсё золата, якое толькі ёсць на свеце, – нікчэмнае драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём”* [2, т. 6, с. 22]. Радасць жыцця – у штодзённай, спакойнай працы: *“Чалавек меў радасць*

*ад таго, што рабіў кожны дзень”* [2, т. 6, с. 43]. Праз усю творчасць К. Чорнага праходзіць ідэя чалавечнасці, сцвярджэнне спагадлівасці, суперажывання чалавека чалавеку (апавяданні “Па дарозе”, “Сцэны”, “Захар Зынга”, “Трагедыя майго настаўніка”). Для пісьменніка чуласць увогуле – адзін з найважнейшых паказчыкаў чалавечай вартасці, своеасаблівы індыкатар чалавечнасці.

Маштабнасць мастацкай задумы пісьменніка – асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа ў кантэксце гісторыі – яднае празаіка з такімі класікамі сусветнай літаратуры, як А. Бальзак (эпапея “Чалавечая камедыя”), Т. Ман (раманы “Будэнброкі”, “Чароўная гара”), У. Фолкнер (цыкл раманаў “Сага пра Ёкнапатофу”), І. Андрыч (“Мост на Дрыгне”, “Траўніцкая хроніка”, “Пракляты двор”). Гэтыя пісьменнікі паўстаюць таксама “інфарматарамі” пра нацыянальнае жыццё для астатняга свету.

Паглыбенне ва ўнутраны свет герояў было працягам галоўнай лініі вялікай літаратуры ўсё больш глыбокага, дакладнага спасціжэння чалавека. К. Чорнаму ўдалося не толькі выявіць нацыянальную ментальнасць, але і адначасова ўвабраць іншанацыянальны мастацкі вопыт, адгукнуцца на яго, нават у нечым прадбачыць, апярэдзіць развіццё еўрапейскай творчай думкі.

Такім чынам, Кузьма Чорны – ключавая постаць беларускай культуры, пісьменнік, які акрэсліў сутнасныя для нацыі праблемы, вызначыў новы ўзровень мастацкага мыслення.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Адамовіч, А. Маштабнасць прозы : Урокі творчасці Кузьмы Чорнага / А. Адамовіч. – Мінск : Маст.літ., 1972. – 198 с.

2. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1972–1975.

**УДК 908(569.1--25)**

## ДОСТОПРИМЕЧАТЕЛЬНОСТИ ДАМАСКА

*Студент – Мохамад Васим, 92м, 1 курс, АМФ*
*Свиков Д.С., 42тс, 3 курс, ФТС*
*Научный руководитель – Дятко И.М., ст. преподаватель*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г.Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация.** Статья посвящена некоторым достопримечательностям одного из самых древних городов мира.